# СВАБОДА

№ 20 (35), 14-20 ВЕРАСНЯ 2006 г.

# СВЯТА ГОРАДА: БУДЗЬЦЕ АСЦЯРОЖНЫ

## МАСАВАЯ БОЙКА Ў ЭЛЕКТРЫЧЦЫ – ВЫПАДАК ЦІ ТЭНДЭНЦЫЯ?



***Электрацягнік Мінск – Пухавічы**, у якім пасля свята горада адбылося масавае пабоішча.*

У ноч на 10 верасня ў электрычцы Мінск – Пухавічы адбылося масавае пабоішча. Разагрэтыя алкаголем на сталічным свяце горада маладыя людзі пачалі збіваць адны адных і ўсіх, хто быў побач, а ў дадатак засыпалі электрычку камянямі, павыкрышыўшы ў ёй шыбы. Дзяўчыне з Мар'інай Горкі камень патрапіў у твар, разарваў губу і выбіў зубы. Лекары наклалі ёй швы, але яна дагэтуль не можа ачуняць. Патруль у складзе двух міліцыянтаў нічога проціпаставіць азвярэламу натоўпу не змог.

Беларуская транспартная міліцыя па факце масавага крывапускання ў электрычцы завяла крымінальную справу. На сёння выяўлены 15 удзельнікаў пабоішча, хоць сведкі сцвярджаюць, што іх было па 30-50 у кожным вагоне.

Адна са сведкаў, мінская студэнтка Кацярына асноўнай прычынай бойкі лічыць п'янства на свяце горада 9 верасня і неадэкватныя паводзіны міліцыі, якая не спыніла масавага ўжывання алкаголю ў публічных месцах. Бойка ў цягніку пачалася са спрэчкі п'яных дзецюкоў, а скончылася разбітымі тварамі пасажыраў, кіданнем камянёў у вокны.

Начное здарэнне ў электрычцы нагадвае пра іншае мінскае свята, калі ў пераходзе метро загінула больш за паўсотню чалавек. Штосьці не ў парадку ў беларускай сталіцы з масавымі святамі. Праўда, гэтым разам гаворка ідзе пра бойку натоўпа супраць натоўпа. Пра такія пабішчы ў Беларусі не было чуваць бадай што з савецкіх часоў.

Узнікае пытанне – што гэта, выпадковасць ці тэндэнцыя? Калі тэндэнцыя, дык карані яе трэба шукаць у "культурнай палітыцы" цяперашняй улады, у яе "дзяржаўнай ідэалогіі" і ў публічных выступах прэзідэнта Лукашэнкі, які час ад часу праз радыё і на тэлеэкране абяцае "абламаць рогі" сваім міністрам. Асатанелая ад алкаголю моладзь бярэ з кіраўніка прыклад.

**Аглядальнік**

## ЧАС БРАЦЦА ЗА МІСІЮ

### ШТО МОЖА ЗРАБІЦЬ АПАЗІЦЫЯ?

► СТАР.4

## ШТО ЧУВАЦЬ НА РАДЫЁХВАЛЯХ

### ПРЭМ'ЕРА РУБРЫКІ

► СТАР.5

# ШТО МОЖА ЗРАБІЦЬ АПАЗІЦЫЯ ГЭТАЙ ВОСЕННЮ?

**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## “НЕ ПЕРАТВАРЫЦЦА Ў НІШТО”

Выбачайце за таўталогію, я думаю, што нават тыя, хто думае пра гэта, не надта ведаюць, што трэба рабіць. Бываюць пэўныя паўзы, правалы, ямы ў любой сферы дзейнасці і ў палітыцы асабліва. Калі што ні рабі, усё на глум. Перарухі ў палітыцы здараюцца нечакана. Як, напрыклад, развал Саюза. А пакуль нічога не выдае на тое, што штосьці можа рэальна зварухнуцца. Што можна рабіць? Я быў супраць ідэі кангрэса, яна мне здавалася цалкам дурацкай. А зараз думаю, што, магчыма, каб хоць чымсьці заняцца, дык хай хоць кангрэс правядуць. Я быў шчыры сімпатык руху “За свабоду”. Але хай бы хто ўцямна мне патлумачыў, чаму гэтая ідэя ляснулася. Гэта выглядала сур’ёзнай ініцыятывай, якая выбудоўвала іншую перспектыву ў разгортцы падзей. Але за лета ўсё знікла і... маўчанне з боку ініцыятараў. Што трэба рабіць, каб умацаваць свае пазіцыі? Тут хутчэй ужо задача як-небудзь утрымаць гэтыя пазіцыі… Хаця, якое утрымаць! Яны ўжо згублены. Тут каб ужо зусім у нішто не зваліцца.

**КРЫСЦІНА ШАЦІКАВА, ГРАМАДСКАЯ АКТЫВІСТКА:**

## “ТРЭБА ВЫХОДЗІЦЬ УСІМ”

Мне цяжка адказваць на гэтае пытанне. Я ведаю, што трэба выходзіць і выходзіць усім, але як гэта арганізаваць зараз, я не ведаю ўвогуле. Калі мы не дамовімся паміж сабой, тады няма пра што гаварыць. Трэба зрабіць так, каб паміж сабой не было сварак. 16 верасня мы паглядзім на настрой людзей. Зараз ёсць спад, але гэта, магчыма, звязана з летам. Усе стаміліся. А зараз новы сезон. Тое, што мы не будзем моўчкі стаяць і глядзець, як нас штурхаюць, гэта факт. Шмат людзей, якія пасля сакавіка пераступілі рысу хвалявання і страху.

**УЛАДЗІМІР, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## “ПРАЙГРАЦЬ ЭЛЕГАНТНА”

Не памятаю, хто з вялікіх сказаў такую цудоўную фразу: “Перамагчы вы можаце па-любому, але прайграць трэба элегантна”. І гэтай восенню ў апазіцыі адна задача. Прайграць як мага больш элегантна. Задача не такая простая. Бо ўсё, што можна было прас...ць, апазыцыя прас...ла ўвесну.

**ЭНІРА БРАНІЦКАЯ, ГРАМАДСКАЯ АКТЫВІСТКА:**

## “ПАДТРЫМАЦЬ ПАЦЯРПЕЛЫХ”

Нічога вырашальнага яны зрабіць гэтай восенню не змогуць. Максімум, што яны могуць зрабіць – гэта захаваць сваю актыўнасць, якая ёсць, і захаваць свой аўтарытэт. Але якім чынам? Я не прыхільніца вулічных акцый. На маю думку, перш за ўсё трэба падтрымліваць тых актывістаў, якія пацярпелі пасля сакавіцкіх падзеяў.

**ІЛЛЯ, СТУДЭНТ:**

## “НІЧОГА НЕ РАБІЦЬ”

Калі не будзе рэферэндума па аб’яднанню з Расіяй, дык можна нічога асабліва і не рабіць. Традыцыйна нагадваць аб сваім існаванні. А ў выпадку рэферэндума пара перастаць быць “добрай” апазіцыяй. Таварышы менты і кагэбэшнікі! Вам не падабаецца такая апазіцыя, якая ёсць? Дык трэба падараваць ім іншую апазіцыю. З пабітым “зімоўскім”, з раскурочаным аўтамабілем “пяткевічаў”, з падпаленым катэджам “шэймана”, з разбітай вітрынаю якога-небудзь “русского” рэстарана. Фантазію можна не абмяжоўваць. А эфект будзе.

**АЛЯКСАНДР ДАБРАВОЛЬСКІ, ПАЛІТЫК, АГП:**

## “УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ВЫБАРАХ”

Рыхтавацца і ўдзельнічаць у мясцовых выбарах. Апазіцыя можа дабіцца значна большай грамадскай падтрымкі, калі шмат людзей, якія пойдуць у якасці кандыдатаў, будуць праводзіць такую грамадскую кампанію па тых пытаннях, якія цікавыя людзям. Але я не гарантую, што даб’ецца. Калі шмат кандыдатаў забудуцца на асноўныя пасланні да людзей, а будуць нейкімі хітрыкамі спрабаваць прайсці ў гэтыя Саветы, дык нічога не адбудзецца. Зараз вельмі важна, каб была прынятая такая стратэгія, якая б выкарыстоўвала кампанію, каб давесці адзінае пасланне да людзей ад імя апазіцыі.

**ВІТАЛЬ, ІНЖЫНЕР:**

## “ІСЦІ Ў НАРОД”

Апазіцыі даўно пара зняць карону з галавы і пачаць займацца чорнаю працай. Перастаць быць элітаю. У нас жа паўсюль эліта. Чыноўнікі – эліта, міліцыя – эліта. Апазіцыя таксама. А да народа, да дзядзькі Васі і цёткі Клавы пакуль што справаў няма. Як гэта ні банальна гучыць, трэба ісці ў народ. Як гэта зрабіць? Хай бы раз на месяц улёткі з’яўляліся ў заводскіх курылках. Гэта ўжо нямала. Ад большага кантакту з электаратам з’явіцца большае разуменне сваёй ролі ў гэтым часе і ў гэтым месцы.

**ЛЕАНІД МІНДЛІН, РЭЖЫСЁР:**

## “ДАКАЗАЦЬ, ШТО ЯНА ПАКУЛЬ ЖЫВАЯ”

Адзінае, што яна можа зрабіць – гэта даказаць, што яна пакуль жывая. Развеяць чуткі пра заўчасную смерць. Але як гэта зрабіць? Калі будуць вулічныя акцыі, дык рэзананс будзе невялікі. Грамадства стабілізавалася і ўнутры эфекта не будзе. Я калісьці займаўся тэорыяй вырашэння вынаходніцкіх задач. Дык там усё было заснавана на нетрывіяльных хадах. Адказ хаваецца ў тым рашэнні, якога ніхто не чакае. Патрэбны нейкія нечаканыя і, я бы сказаў, светлыя акцыі. Але я на гэтую тэму не думаў. Усё мае адны законы. Сцэнар палітычны, сцэнар кіношны. Здаецца, у нас не хапае добрых палітсцэнарыстаў і палітрэжысёраў.

**АДАСЬ, ВЯСКОВЫ НАСТАЎНІК:**

## “ПАШЫРАЦЬ ІНФАРМАЦЫЮ”

Шмат чаго можна зрабіць. Было б жаданне. У нашым мястэчку прыкладна 1400 выбарцаў. З іх 250 чалавек заўжды галасуюць супраць сённяшняй улады. Гэта немалая сіла. Так. Сустрэчы з апазіцыйнымі палітыкамі зараз немагчымыя. Калі б я меў хоць якое дачыненне да арганізацыі такой сустрэчы, дык развітаўся б з любімай працай. Але ж можна распаўсюджваць інфармацыю. Друкаваную прадукцыю разносіць. Нават тузін людзей маглі бы “нарабіць шораху”. Далей, культурніцкая дзейнасць. Канцэрты, сустрэчы з літаратарамі. Гэта мы можам арганізаваць. У людзей, асабліва ў моладзі, гэта пойдзе на “ура”. І яшчэ больш папулярызаваць беларускую мову.

**Працяг тэмы на стар. 4.**

# У МІНСКУ ЗАТРЫМАНЫ ВЯЧАСЛАЎ СІЎЧЫК

*Адзін з актывістаў беларускай апазіцыі Вячаслаў Сіўчык затрыманы ў сталіцы РБ, паведамілі ў сераду ў Галоўнай управе ўнутраных спраў Мінгарвыканкаму. Яго ўзялі ў аўторак ў адной кавярні.*

Як тлумачаць улады, Сіўчык быў затрыманы "ў сувязі з тым, што ў дачыненні яго ёсць рашэнне суда аб адміністрацыйным арышце за ўдзел у несанкцыянаванай вулічнай акцыі пасля выбараў прээзідэнта Беларусі ў сакавіку 2006 году".

Нагадаем, 19 сакавіка Вячаслаў Сіўчык быў завочна асуджаны на 10 сутак за ўдзел у намётавым лагеры на цэнтральнай плошчы ў Мінску, адным з арганізатараў якога палітык быў.



Паводле звестак міліцыі, Сіўчык увесь гэты час знаходзіўся на тэрыторыі Украіны і толькі нядаўна прыехаў у Мінск. Маці Сіўчыка паведаміла, што ён быў затрыманы ў кавярні "Бамонд" супрацоўнікамі палка міліцыі спецыяльнага прызначэння. У кавярні ён сустракаўся з журналістам, перадае Інтэрфакс-Украіна.

Цяпер апазіцыйны палітык утрымліваецца ў турме на Акрэсціна, адкуль выйдзе ўвечары 22 верасня.

# ВЯЧАСЛАВА ГАРБУЗАВА З БРСМ — АДМАЗАЛІ

Адбылося тое, што і мелася адбыцца. Улада яшчэ раз прадэманстравала, што напісаныя ёю законы не пашыраюцца на ўсіх. Любімчыкі могуць не турбавацца – для іх заўсёды застаецца магчымасць пазбегнуць адказнасці. А як інакш растлумачыць рашэнне суда Ленінскага раёна Брэста пра спыненне справы камандзіра абласнога штаба студэнцкіх атрадаў БРСМ Вячаслава Гарбузава "ў сувязі са сканчэннем тэрміна адміністрацыйнага спагнання".

Пасля таго, як высветлілася, што В.Гарбузаў накіраваў на працу ў Расію грамадзянку Беларусі, дзе дзяўчына насуперак кантракту выконвала іншую працу, цярпела здзекі з боку працадаўцы і атрымлівала заробку, разгарэўся нежартоўны скандал. На функцыянера БРСМ быў складзены адміністрацыйны пратакол аб парушэнні дэкрэта прэзідэнта РБ № 3 "Аб некаторых мерах супрацьдзеяння гандлю людзьмі". Абвінавачанне вельмі сур'ёзнае – згадаем, як жорстка Лукашэнка выступаў за навядзенне парадку ў гэтай сферы і за пакаранне ўсіх вінаватых у гандлі людзьмі. Але суд на сваім пасяджэнні 31 жніўня не прыняў пад увагу заклапочанасць кіраўніка дзяржавы і фактычна адмазаў бээрэсэмаўскага важака.

Улада не раз дэкларавала, што ў Беларусі будуецца прававая дзяржава. Але на практыцы словы далёка разыходзяцца са справамі. Атрымліваецца, што тыя, хто лаяльны да ўлады, заўсёды могуць спадзявацца на паблажкі. Толькі вось уладай закона ў такой краіне нават і не пахне.

**Алег Ман**

# ПРЭМІЯ ІМЯ А.САХАРАВА – ДЛЯ А.МІЛІНКЕВІЧА

*Еўрапарламент афіцыйна вылучыў Аляксандра Мілінкевіча кандыдатам на прэмію імя А.Сахарава за 2006 год.*

Вылучэнне кандыдатуры Мілінкевіча падтрымала найбуйнейшая фракцыя Еўрапарламента – "Еўрапейская народная партыя – еўрапейскія дэмакраты". "Прысуджэнне прэміі імя Сахарава важна як для справы дэмакратыі ў Беларусі, так і для асабістай бяспекі Мілінкевіча, які працягвае падвяргацца ўціску з боку рэжыма Лукашэнкі" – сказана ў заяве фракцыі. На думку дэпутатаў фракцыі, "калі прэмію імя Сахарава прысудзяць сёлета Мілінкевічу, гэта будзе рашучым сігналам для дыктатарскага рэжыму Лукашэнкі аб тым, што Еўрасаюз не забыў пра сітуацыю ў Беларусі".



Прэмія імя Сахарава "За свабоду думкі" заснаваная Еўрапарламентам у 1988 годзе і прысуджаецца штогод за "дасягенні ў справе абароны правоў чалавека і яго асноўных свабод, а таксама за павагу да міжнароднага заканадаўства і развіццё дэмакратыі". У спісе ранейшых лаўрэатаў прэміі імя Сахарава – Кофі Анан, Нэльсан Мандэла, арганізацыя "Рэпарцёры без межаў". Летась такую прэмію атрымала Беларуская асацыяцыя журналістаў.

**Паводле СМІ**

# "ПЛОШЧА КАЛІНОЎСКАГА"

Кінарэжысёр Юры Хашчавацкі завяршыў працу над новым фільмам. Чарнавы варыянт назвы — "Плошча Каліноўскага". Кіно апавядае пра падзеі часу выбарчай кампаніі. Рэжысёр разлічвае найперш на маладую аўдыторыю. Ён кажа, гэта фільм пра моладзь вачыма старэйшага пакалення.

У фільме "Плошча Каліноўскага" Павал Севярынец, які адбывае пакаранне на "хіміі" ў вёсцы Малое Сітна, разважае пра стан беларускай правінцыі й яе перспектыву. Паралельнай лініяй ідзе гутарка з дзяўчынай Дашай, якая прыходзіла ўначы ў намётавы лагер і перажыла разам з іншымі сотнямі ўдзельнікаў акцыі затрыманне, суд і турму.



— Яны іншыя, — кажа Ю.Хашчавацкі, — яны не такія, і мы мусім іх зразумець хаця б дзеля таго, каб утрымацца побач з імі і дапамагчы ім. Гэты працэс нагадвае тое, што адбывалася ў 1968 годзе ў Францыі. Менавіта тады стала зразумела, што не моладзь павінна ісці за старэйшым пакаленнем, а часам — наадварот. У каго падымецца рука асуджаць сталых людзей у вёсках, у якіх так адпрацаваная псіхіка, бо іх увесь час прыніжалі, забівалі і фашысты, і НКВД, і КГБ… А маладыя не жадаюць быць рабамі.

Юры Хашчавацкі лічыць, што ма ладым будзе цікава паглядзець на сябе, але яшчэ цікавей паглядзець на сябе вачыма чалавека старэйшага пакалення.

**Паводле РС**

# ЧАС БРАЦЦА ЗА МІСІЮ

## ШТО МОЖА ЗРАБІЦЬ АПАЗІЦЫЯ

Сённяшняе апытанне на тэму “Што можа зрабіць апазіцыя?” сведчыць пра тое, што людзі не звязваюць сваіх спадзяванняў на блізкія перамены з апазіцыяй, а гэта значыць, не вераць, што ў апазіцыі ёсць рэальныя рычагі ўплыву на сітуацыю і хоць колькі-небудзь вызначальная роля ў грамадскім жыцці. Апазіцыя ёсць і яе быццам няма.

Прычына гэтага – у самой прыродзе апазіцыі. Яна – парламенцкая, нават не вулічная, не тое, што рэвалюцыйная. Яе натуральнае асяроддзе – кулуары, фракцыі, перамовы. Яе звышзадача – пошук кансэнсуса, гэта значыць – гармоніі і згоды. Іншымі словамі, яна ў нас роўна адваротная таму, чаго ад яе чакаюць, і тым задачам, якія апазіцыя вырашае ў аўтарытарнай дзяржаве. А менавіта – ісці на абвастрэнне, на жорсткае супрацьстаянне, на рэвалюцыю.

Каб ясней убачыць гэтую неадпаведнасць, дастаткова ўявіць сабе парламенцкую апазіцыю ў СССР часоў Сталіна ці ў Германіі часоў Гітлера. Нават калі б яна такая і была, яе ўплывы на сітуацыю былі б на нулі. Бо ў такіх сістэмах штосьці значыць не пошук гармоніі, а наадварот: цынічны лобінг у кулуарах улады, выкіды кампрамату, “разрульванне” фінансавых патокаў – усё тое, за што палітыку называюць бруднай справай.

Лукашэнка і імкнецца разглядаць апазіцыю такой – адпаведнай сабе. Адсюль сюжэты пра падрыхтоўку апазіцыі да тэрактаў напярэдадні выбараў, адсюль гэтае бандыцкае азначэнне – “адмарозкі” на адрас акадэмікаў і народных паэтаў, адсюль гэтыя прысуды інтэлігенцыі з фармулёўкай “ішоў па вуліцы, ругаўся матам”...

Самыя экстрэмальныя дзеянні нашай апазіцыі – гэта выхад на несанкцыянаваны мітынг з незарэгістраванай сімволікай. Зразумела,



**Флэш-моб на** *цэнтральнай плошчы. Маладыя людзі дакрануліся рукамі да месца, дзе стаяў намётавы лагер.*

што ўскладаннем кветак да помніка Перамогі гэты рэжым не скінеш і ўладу не перахопіш. Парламенцкая апазіцыя ў дыктатарскай краіне пазбаўленая любых легальных і мірных (а іншых яна не мае) магчымасцяў рэальна ўплываць на грамадства. Яна асуджаная на адмоўны рэйтынг і, не будзь ёй дапамогі звонку, як з’ява даўно б перастала існаваць. Дакладней, рассыпалася б на адзінкі дысідэнтаў, што ў рэгіёнах сям-там ужо і адбылося.

З гледзішча абстрактнай будучыні Беларусі выгадна мець “у запасе” парламенцкую апазіцыю, гатовую зараз арганізаваць у краіне нармальнае палітычнае жыццё – з рэальнымі выбарамі, партыямі, фракцыямі, з кадравымі палітыкамі і г.д. Вось толькі ніхто не ведае, калі гэта ўсё спатрэбіцца і ці спатрэбіцца ўвогуле. Пры гэтым парламенцкая апазіцыя не можа доўга захоўвацца ў такім закансерваваным выглядзе. Дый існаваць толькі таму, што цябе нехта падтрымлівае, — матывацыя яўна не рэйтынгавая.

Апазіцыя спрабуе “ісці ў народ”, але і тут галоўнае пытанне – з чым? Калі вы супраць дыктатуры, а ваш уплыў на грамадства зведзены да нуля, калі вы ваюеце з ростам камунальных расцэнак, а самі ніяк на гэтую сістэму не ўплываеце, калі вы кажаце пра незалежнасць і Лукашэнка кажа пра тое самае, тады вынік паходу “ад дзвярэй да дзвярэй” можа мець адваротны эфект. Калі вы абяцаеце, што зробіце нешта, прыйшоўшы да ўлады, а пры гэтым і вам, і ўсім ясна, што да ўлады вы не прыйдзеце, — гэта таксама не рэйтынгавая матывацыя.

Выглядае, што апазіцыі ўжо сёння трэба было б задумацца пра сябе саму, калі яна рассыплецца на дысідэнцкія мікрагрупы – гэта значыць, дойдзе да апошняй мяжы. Задумацца менавіта для таго, каб захавацца. Прырода дысідэнта найбольш трывалая, бо ён выконвае місію. Напрыклад, у сённяшняй Беларусі, дзе адбываецца татальная дэбеларусізацыя ўсяго і ўся, менавіта дысідэнты падтрымліваюць сваім чынам Культуру і Традыцыю.

Беларушчына – нацыянальная годнасць беларуса, традыцыя і мова – гэта, бадай, адзіная сфера, якая a priori прызнаецца народам за сваю, і з якой вядзе адкрытую вайну рэжым Лукашэнкі. Гэты, па сутнасці сваёй бюракратычны прарасійскі рэжым не сустракае сур’ёзнага адпору і сур’ёзнай крытыкі менавіта з боку нашай парламенцкай апазіцыі. Пакрыўджаны нацыянальны гонар цэлага народа застаецца не тое, што не адплочаным, а часта нават і не заўважаным. І гэты пры тым, што беларушчына і ёсць у нас той лініяй фронту, якая падзяліла дэмакратычныя каштоўнасці і аўтарытарна-бюракратычныя парадкі. Улада не гаворыць па-беларуску, улада закрывае школы і выганяе беларушчыну з публічнага жыцця. А апазіцыя толькі пятым пунктам крытыкуе такую палітыку, не жадаючы ўбачыць свой уласны патэнцыял, свой рычаг уздзеяння на працэсы ў краіне, сваю галоўную місію.

Дзеці з закрытага ліцэя альбо пісьменнікі, выгнаныя з Дому літаратара менавіта на апазіцыю паглядалі, як на сваю ўладу і сваю надзею. Тое самае адбылося з тысячамі і тысячамі звольненых настаўнікаў, журналістаў, навукоўцаў, краязнаўцаў і проста беларускамоўных людзей. Але гэты вялізны грамадскі патэнцыял не пабачыў у парламенцкай апазіцыі той “сваёй улады”, на якую ў глыбіні душы спадзяваўся.

Апазіцыі так і не ўдалося знайсці пляцоўку, на якой бы яна магла рэальна спаборнічаць з уладай, адваёўваць захопленую тэрыторыю, адбудоўваць разбураныя аб’екты, будаваць у Беларусі сваю беларускую Беларусь. Магчыма, эвалюцыйным шляхам наша апазіцыя ўсё ж знойдзе гэтую занядбаную місію і тады – уратуецца сама. Калі ж не, тады праз гады ў Беларусі з дысідэнцкіх мікрагрупаў паўстане новая апазіцыя. Ці будзе яна парламенцкай – пакажа час.

**Алесь Кебік**

# ВАКОЛ РАСІЙСКАГА ГАЗА

## ЦІ САГРЭЮЦЦА БЕЛАРУСЫ ЭМОЦЫЯМІ ПРЭЗІДЭНТА?

Адкрыты восеньскі раўнд перамоваў з Расіяй пра цэны на газ у 2007 годзе. Прычым бакі падышлі да іх, стоячы на тых самых непрымірымых пазіцыях, што і ў пачатку лета, калі газавыя жарсці толькі пачыналі разгарацца. Аднак жа калі расіянам пакуль удаецца захаваць вытрымку, дык у Лукашэнкі, мяркуючы па ўсім, пачынаюць здаваць нервы. Прынамсі, ён адразу ж зрабіў некалькі рэзкіх і вельмі эмацыйных заяваў. "Расія прадае нам нафту даражэй, чым Украіне, а цану на газ прапануе даражэй, чым Германіі, — заявіў А.Лукашэнка журналістам. – Мы ніколі не будзем купляць газ даражэй, чым Германія, бо яшчэ тыя людзі не памерлі, якія ў адных акопах з расіянамі гіблі. Мы абсалютна не супраць, каб цэны раслі, але яны павінны быць такія, як у Расіі, бо гэта закладзена дамовай аб саюзнай дзяржаве".




Каб разабрацца з гэтым выказваннем Лукашэнкі, трэба ўдакладніць, што Германія купляе расійскі газ па 250 даляраў за тысячу кубаметраў. Такім чынам, ёсць два варыянты з'яўлення гэтай тырады прэзідэнта – альбо ўсё насамрэч яшчэ горш, чым меркавалася, і "Газпром" прапануе купляць газ не па 100 даляраў, як было аб'яўлена раней, а па 250. Тады хоць ваўком вый. Альбо Лукашэнка ва ўласцівай яму манеры некалькі сказіў факты для таго, каб у чарговы раз згуляць на тэме братэрства Беларусі і Расіі.

Пасля таго, як сёлета вясной Уладзімір Пуцін узяў эканамічную палітыку ў адносінах да Беларусі пад асабісты кантроль, афіцыйны Мінск стаў зусім не здольны дамаўляцца з Расійскай Федэрацыяй.

На парозе восень, а расіяне па-ранейшаму непрабівальныя. Беларускія энергетыкі з апярэджаннем усталяванага графіка выканалі план нарыхтоўкі мазуту да новага ацяпляльнага сезону. Толькі вось пры неспрыяльных умовах – адсутнасці газа і максімальна нізкай тэмпературы – мазуту хопіць усяго для дзесяцідзённага забеспячэння патрэбаў краіны.

Трэба дамаўляцца з Расіяй, але як?

"Газпром" даў свае каментары, прычым быў максімальна лаканічны: "З наступнага году мы пераходзім у гандлі з Беларуссю на рынкавыя прынцыпы. Цана газа і прапанаваных актываў павінна быць адэкватная рынку".

Вось так. Спакойны тон расіян можна зразумець – у іх ёсць час. А вось беларускаму боку прыходзіцца нясоладка. І чым бліжэй будуць першыя маразы, тым больш эмацыйнай будзе рэакцыя таго ж Лукашэнкі. Толькі ж толку з таго.

**Алег Ман**

## Што чуваць

# НАВІНЫ, ПРАГРАМЫ, НАЦІСКІ

Я люблю слухаць радыё – сёння для мяне гэта галоўная крыніца вестак, што чуваць у свеце і ў Беларусі. Радыё ў мяне ўключана цэлы дзень – толькі паспяваю пераключаць хвалі ды станцыі. Трохі слухаю літоўскія праграмы, многа слухаю Свабоду на рускай мове, а галоўнае – беларускія незалежныя станцыі. Свабода, Рацыя, Акно ў Еўропу. Зрэдзь часу – беларускія праграмы радыё Палонія і Нямецкай хвалі. Выпадкова можна нарвацца на беларускія сюжэты на Галасе Амерыкі ды Французскім міжнародным радыё. Натуральна, многае з пачутага ў адно вуха залятае, а з другога тут жа вылятае – даводзіцца прасейваць горы слоўнай руды, каб знайсці залацінку цікавай інфармацыі.

Пасля летніх вакацыяў толькі Свабода паспрабавала парадаваць слухача новымі перадачамі. (Астатнія можа ўпэўнены, што ўжо дасягнулі вяршыняў дасканаласці?) Перадача "У што я веру" абяцае быць цікавай, толькі б слухачы ў яе паверылі. Заўсёды цікава пачуць новы голас, пазнаёміцца з новым чалавекам. "Верасень з Данчыкам" – выдатна, прыемна, смачна. Спадзяюся, будзе працяг – кастрычнік з Камоцкім, лістапад з Шалкевічам... Адно пытанне: чаму песні абрываюць на паўслове, гэта ж не фонавая музыка, а цэльная аўтарская перадача. Паспрабавалі б гэтак абысціся з любым рэпартажыкам – гвалт, крыўда. Дык гэтаксама крыўдна паэту, кампазітару і спеваку. А вось рэтраспектыва падзеяў 1996 году непрыемна здзівіла. Без каментароў гісторыка і палітолага гэтыя напаміны пра колішнія паразы і памылкі – толькі соль на раны. Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ведаць пра яе штосьці прыемнае, прывабнае, пераможнае. І, нарэшце, анонс перадачы "Вянок памяці". Стала страшна – няўжо прагназуецца частая і рэгулярная патрэба ў выпусках такой перадачкі? Няўжо з чорнага чорнага лесу ўжо выехала чорная чорная машына...

У першыя выходныя верасня ў Беларусі святкуецца Дзень пісьменства і друку. Усе радыёстанцыі крытычна ацанілі, як дзяржава адзначыла гэтае свята. Гэтаксама дружна і крытычна ацанілі новыя правілы правапісу, высяленне Саюзу пісьменнікаў з Дому літаратара, далейшае змяншэнне беларускамоўных вучняў, перавод выкладання гісторыі ды геаграфіі на рускую мову і гэтак далей. Выснова кожны раз аднољ-

**Працяг на стар. 6**

# ФІЛЬТРЫ ЯК ЗНАК ПАВАГІ

## АЛЬБО ЯШЧЭ РАЗ ПРА "ЧАС ЗБІРАЦЬ КАМЯНІ"

У дзяржаўным штодзённым выданні "Народная газета" прыцягнуў увагу матэрыял у рубрыцы «Голас народа». Называецца артыкул "Законны ли детсадовские поборы". Кабета, якая пажадала застацца невядомай, падымае заслону над «клопатам дзяржавы пра самых маленькіх гарамадзян»:

*"Чаще всего родители не спорят просто из боязни испортить отношения с администрацией детского сада -- на этой почве может возникнуть неприязнь к ребенку. Но отдельно мне хотелось бы вспомнить праздники в садах. С тем, что воспитателям дарят подарки в таких случаях, я согласна. Я не согласна с тем, какие. Подарки для воспитателей должны быть символическими, как знак уважения. А мы дарим фильтры очищающие, покрывала, электрочайники… Таким отношением мы просто самолично развращаем своих детей. Еще я принципиально отказалась сдавать деньги на обустройство детского сада охранно-пожарной сигнализацией. Искренне убеждена, что этим должна заниматься организация, на чьем балансе содержится здание детского сада, либо же шефствующие организации, но никак не родители".*

Цікава, а калі ўсе выхавальніцы разжывуцца чайнікамі і фільтрамі, чым яшчэ прыйдзецца задавальняць бацькам чужыя апетыты? Будуць дарыць мабільнікі? Мэблю? Ці, можа, адразу будуць разлічвацца «чорным налам»? Мне асабіста гэтых бацькоў не шкада. Шкада дзяцей, якія ад першых крокаў выхоўваюцца ў такой сістэме, дзе трэба ведаць, каму даць, што дзе сказаць і калі маўчаць.

"Советская Белоруссия" працягвае знаёміць сваю аўдыторыю з родным краем. Гэтым разам газета звярнулася да найвышэйшай кропкі Беларусі, здаўна вядомай пад назвай Святая гара:

*"Гора Дзержинская, как истинная скромница, спряталась от прохожих за хвойным леском. Среди развалин ремонтных мастерских, за бетонным заборчиком зеленого цвета высится знак: «Высшая точка Беларуси». А рядом подпись кисточкой: «Гора имени Иисуса Христа». По словам местных жителей, сделали ее три года назад представители одной из местных религиозных общин. — Минский лесхоз разобьет здесь дендрарий из типичных для Беларуси растений. В середине октября, надеюсь, гора примет цивилизованный вид, — обнадежил меня начальник Дзержинской районной инспекции природных ресурсов и охраны окружающей среды Михаил Шурко.*

*На все про все экологам выделили 20 миллионов рублей. Этих денег, понятное дело, не хватит, дополнительные средства должны поступить из районного бюджета. Некоторые местные чиновники уже поспешили заявить, что обновленная Дзержинская скоро будет включена в туристические маршруты".*

Безумоўна, іншаземцам будзе на што падзівіцца. На Святой гары знаходзіцца закінуты калгасны мехдвор. Парэшткі трактараў і камбайнаў выглядаюць не горш за косткі дагістарычных жывёлаў. Не менш рамантычна глядзяцца руіны майстэрняў. Няўжо гэтае ламачча будзе нарэшце прыбранае? Дзякуй і на тым. Бо слаба верыцца, каб сённяшнія ўлады вярнулі гары яе спрадвечнае імя. Абы чарговага Сталіна там не паставілі…

А прафесар Леанід Лыч у "Звяздзе" абураецца намерам мінадукацыі выкладаць гісторыю Беларусі на мове братняга народа.

*"Не трэба ўразаць функцыі беларускай мовы ў навучальна-выхаваўчым працэсе, а наадварот, варта шукаць шляхі іх пашырэння. Калі, апіраючыся на волю, жаданне часткі бацькоў і іх дзяцей, Міністэрства адукацыі РБ задаволіць іх просьбу на выкладанне гісторыі па-руску, дык з цягам часу гэтыя асобы могуць запатрабаваць выключыць са школьных праграм беларускую мову і літаратуру або будуць дабівацца дазволу вывучаць апошнюю па перакладзеных на рускую мову літаратурных творах беларускіх пісьменнікаў. З такімі ж з'явамі мы ўжо сустракаліся ў пік ажыццяўлення КПСС палітыкі на збліжэнне і зліццё савецкіх нацый і народнасцяў. Тады нават некаторыя выкладчыкі Гомельскага педінстытута спрабавалі беларускую літаратуру выкладаць па-руску. Дзякаваць Богу, гэтыя часы ў нашым нацыянальна-культурным жыцці мінулі. Прыйшоў час збіраць камяні".*

З чаго гэта шаноўны прафесар узяў, што "часы мінулі"? Я не здзіўлюся, калі даўняя ініцыятыва гомельскіх выкладчыкаў знойдзе працяг у заўтрашнім дні. Цешыць толькі тое, што ініцыятывы іхнія прыдатныя хіба толькі для часоў друкаваных машынак і лінатыпаў. У эпохі інтэрнэту і адкрытых межаў свае законы.

**Алесь Канюціч**

# НАВІНЫ, ПРАГРАМЫ, НАЦІСКІ

**Працяг са стар. 5**

кавая – гэтая дзяржава паслядоўна і метадычна знішчае беларушчыну. Але ж ці гэта навіна? А як бы хацелася пабач з гэтымі сумнымі весткамі пачуць і штосьць абнадзейваючае – якіясь невялікія перамогі грамадскіх арганізацый, ініцыятывы прыватных асобаў. Вось, напрыклад, у Літве і Польшчы арганізуюць нацыяльнаныя конкурсы граматнасці – усе ахвотныя пішуць дыктоўкі, пераможцы атрымліваюць прызы і дыпломы. Дык чаму б журналістам з незалежных СМІ не арганізаваць паміж сабой такі конкурс.

Дарэчы, пра граматнасць. Не крыўдуйце, калі ласка, але маё вуха драпаюць такія-сякія моўныя перлы, што гучаць на нашым радыё. На Еўрарадыё спадар Чайкін гавора пра навіны спорту і ўвесь час паўтарае слова "нічча", сустрэча закончылася "ўнíччу". А чым ужо стаў нямілы вынік, нічыя перамога? На Рацыі шаноўны гісторык Гардзіенка знаёміць з календаром памятных датаў і аднойчы кажа пра эміграцыю, маўляў, край пазбыўся "колеру грамадства". Я думаю, тут меўся на ўвазе "цвет общества", але па-беларуску гэты выраз трэба сказаць зусім іншымі словамі – патрыятычная эліта, лепшыя людзі ці якнебудзь яшчэ. Дарэчы, "цветная капуста" па-нашаму така будзе не "каляровая", а кваецістая. Цэлая бяда з націскамі. Можна пачуць – "злодзеі залезлі праз гАрышча", "былі пастаўлены плОты". Гэта значыць, людзі ніколі не чулі вясковых бабуляў, не ведаюць, што гарЫшча – ад слова гара, а не ад слова гарэць, і слова плот у множным ліку мяняе націск – платЫ. А дарэчы, што парадзіць прафесійны філолаг – як вывучыць слушна нашыя націскі?

**Сяржук Вітушка**

СТРЭМКІ

# ВІРТУАЛЬНЫ ЛЕНІН

## ШТО НАС АДРОЗНІВАЕ АД ЖЫВЁЛАЎ?



Паэта Вазнясенскага, мабыць, да скону непрыяцелі будуць папракаць вершам «Уберите Ленина с денег». А ён жа пра Леніна яшчэ й паэму напісаў. Як і ягоны калега Еўтушэнка ды яшчэ раней – Маякоўскі.

Наўрад ці гэтыя творы будзе хто цяпер перавыдаваць і чытаць. А я ў свой час прачытаў і магу засведчыць: гэта – паэзія. Узровень, скажу вам, не горшы нават за Хадановіча.

Такое не напішаш "по заказу партии". Ад сэрца пісалася. А ці магло быць іначай?

Што ведалі пра Леніна ўсе тры аўтары, які зыходны матэрыял, якое ўяўленне яны мелі?

Чалавек, які ўсё жыццё прысвяціў справе вызвалення прыгнечаных і абяздоленых. Беззаганнай маральнасці і чысціні. Мудры і адважны.

Ды справу яго жыцця зняважыў, спаганіў і перакруціў палітычны спадкаемца мярзотнік Сталін. Які яшчэ й подла вынішчыў "ленінскую гвардыю".

Тут не паэмы – легенды і быліны трэба пісаць!

Праўда, паэтам неяк не прыходзіла ў галаву простая думка – ці можна назваць "гвардыяй" групу людзей, якая давала сябе выразаць без супраціву? І мо не зусім мудрай і бездакорнай была асоба, вакол якой згуртавалася падобная "гвардыя"?

Але гэта ўжо дэталі.

Праблема ў тым, што бадай усе гістарычныя персанажы, якіх мы ведаем – у той ці іншай ступені – віртуальныя!

Што ведае пра Чэ Гевару той, хто носіць ягоны партрэт на сваёй майцы?

Мы ведаем усіх герояў не такімі, якія яны былі, а якімі іх апісалі для нас іншыя людзі, са сваімі сімпатыямі і антыпатыямі, сваімі інтарэсамі і ідэямі.

Вось мы звыклі верыць летапісам.

Думаеце, на летапісца ніхто не ўздзейнічаў? Не было над ім бізуна? Не хацеў ён нікому дагадзіць? Нешта замаўчаць, а нешта, наадварот, падкрэсліць? І як цяпер спраўдзіць?

Вось Грунвальдская бітва – у ёй перамаглі тыя, на чыёй мове яна апісана. Па-польску – палякі, па-літоўску – літоўцы (т. зв. летувісы). Але ж мы ведаем – беларусы! (Праўда, тады такога тэрміна не існавала, але ці гэта важна!)

Ды ўвогуле, віртуальная не толькі гісторыя. Віртуальны свет існуе столькі, колькі сам чалавек. Нябёсы, воды і лясы засяляліся віртуальнымі багамі. У казках і паданнях дзейнічалі віртуальныя героі.

А ўсё мастацтва? Уся літаратура? Прычым не толькі тая, што "фэнтэзі". Наташа Растова – такі ж віртуальны персанаж, як і Гары Потэр.

Віртуальныя асобы часам аказваюць на наша жыццё больш ўплыў, чым рэальныя. Для гэтага патрэбна наша цвёрдая перакананасць у рэальнасці неіснуючай на справе асобы. І тады віртуальны Азірыс або Даждждбог адзавецца на малітвы і выканае нашу рэальную просьбу. І, абапіраючыся на віртуальнага Леніна, можна змагацца з рэальным сталінізмам.

Увогуле, віртуальны свет – гэта тое паветра, той кісларод, без якога наш інтэлект існаваць не можа.

Магчыма, здольнасць існаваць адначасна ў двух светах – рэальным і віртуальным – і ёсць тое, што нас адрознівае ад жывёлаў.

Хоць хто яго ведае. Вось пішу, а насупраць мяне ляжыць на крэсле вялікі рыжы кот і неяк надта ўжо задуменна глядзіць кудысь у прастору...

**Алег Аблажэй**

# НЕВЯДОМАЯ БЕЛАРУСЬ

**14 верасня** ў 1806 годзе, 200 гадоў назад, нарадзіўся беларускі музыка, вынаходнік ксілафона Міхал Гузікаў. Ён прыйшоў на свет у Шклове. У 30-я гады 19-га стагоддзя Гузікаў удасканаліў беларускі народны інструмент брусочкі, з чаго і атрымаўся сучасны ксілафон. Далей пачынаюцца гастрольныя паездкі музыкі ў Аўстрыю, Германію, Бельгію, Францыю. Гузікаў грае Вебера, Гумеля, Паганіні, а між іншым, і беларускія народныя песні. Пра яго пішуць газеты і слоўнікі, у Вене выходзіць кніжка «Гузікаў і ягоны інструмент з дрэва і саломы».

**16 верасня** 1745 году з'явіўся на свет расійскі вайскаводзец Міхаіл Галянішчаў-Кутузаў. Ягоны вобраз у многіх сфармаваны раманам і фільмам «Вайна і свет». Але мала хто ведае, што «засвяціўся» ён і ў нашых краях. У канцы 18 стагоддзя ён быў засланы ў Вялікае Княства Літоўскае стварaць партызанскія атрады супраць законнае ўлады. Пасля нейкі час Кутузаў быў вайсковым губернатарам літоўскім і віленскім на акупаваных расійскай імперыяй землях Княства.

**17 верасня** 1891 году нарадзіўся Антон Баліцкі — адзін з пляяды беларускіх нацыянал-камуністаў, міністр асветы БССР, які за сваю патрыятычную дзейнасць быў засуджаны на 10 гадоў турмы, а ў 1937-м – расстраляны.

**18 верасня** 1995 году на загад кіраўніцтва РБ самалётзнішчальнік беларускіх ВПС збіў паветраны шар, які пралятаў над краінай па ўзгодненым маршруце міжнароднага мірнага мерапрыемства. Экіпаж шара — 2 чалавекі — загінуў пры падзенні. Адным з падарожнікаў быў амерыканскі ветэран вайны з гітлераўскай Германіяй.

**20 верасня** 1903 году прыйшла на свет слаўная беларуская паэтка Наталля Арсеннева. Яе верш "Магутны Божа" ўважаецца цяпер за адзін з беларускіх гімнаў.

# “ЧЭСНЫМ ПІСЬМЕННІКАМ” – ПАДТРЫМКА ЛУКАШЭНКІ

Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб вылучэнні ўрадам сродкаў на фінансаванне дзейнасці Саюза пісьменнікаў Беларусі на чале з генералам Мікалаем Чаргінцом. Кіраўніцтва спраў прэзідэнта павінна таксама забяспечыць СПБ памяшканнямі, транспартнымі сродкамі, аргтэхнікай і г.д.

Нагадаем, што перад гэтым Саюз беларускіх пісьменнікаў на чале з Алесем Пашкевічам быў выгнаны з Дому літаратараў, які належыць зараз адміністрацыі прэзідэнта. Ніводзін з вядомых пісьменнікаў не перайшоў з гэтай старэйшай творчай арганізацыі Беларусі ў арганізацыю Чаргінца, лаяльную ўладам. Сваё стаўленне да беларускай мовы аўтар дэтэктываў Чаргінец нядаўна выказаў зноў на экране БТ. Гаворачы пра акцыю пратэсту на плошчы Якуба Коласа, дзе хлопец, апрануты ў чырвона-зялёны балахон, павесіў на “шыбеніцы” падручнік гісторыі Беларусі, былы міліцыянер паабяцаў: “Праваахоўчыя органы знойдуць гэтага сукінага сына!” На думку Чаргінца, няма нічога страшнага ў тым, што гісторыю Беларусі будуць выкладаць у школах па-руску – “матэматыку ж выкладаюць”.

**Паводле belaruspartizan.org**




**belzhaba.com**

KAMUNIKAT.org

ЯК ТОЛЬКІ З’ЯВІЛІСЯ ПЕРШАДРУКАРЫ – З’ЯВІЛІСЯ І ЦЭНЗАРЫ. БЫЛО ВЫНАЙДЗЕНА РАДЫЁ – З’ЯВІЛІСЯ “ГЛУШЫЛКІ”. 15 ГАДОЎ ТАМУ НАРАДЗІЎСЯ ІНТЭРНЭТ. І АДРАЗУ КАМУНІСТЫЧНАЯ ЎЛАДА ПАЧАЛА ШУКАЦЬ УПРАВУ НА ЯГО. ПІШУЦЬ, ШТО ЎРАД РБ НЯДАЎНА ЗАКУПІЎ У КІТАІ “МАШЫНЫ ДЛЯ АЎТАМАТЫЧНАЙ АПРАЦОЎКІ” (АЖНО НА 20 МІЛЬЁНАЎ ДАЛЯРАЎ), КАБ КАНТРАЛЯВАЦЬ СЕЦІВА І НЕ ДАПУСКАЦЬ З’ЯЎЛЕННЯ Ў ІМ СЛОВАЎ КШТАЛТУ “СВАБОДА”.

АЛЕ ЎСЕ ГЭТЫЯ ВЫНАХОДНІКІ ЗАБЫВАЮЦЬ, ШТО СВАБОДА ІСНУЕ НЕ Ў ТЭКСТАХ І НЕ Ў ТЭХНІЧНЫХ ПРЫЛАДАХ, А Ў НАШЫХ З ВАМІ ГАЛОВАХ. ЧЫМ БОЛЬШ ЛЮДЗЕЙ БУДЗЕ ДУМАЦЬ І АДЧУВАЦЬ СЯБЕ ВОЛЬНЫМІ, ТЫМ МЕНЕЙ ШАНЦАЎ У НАЧАЛЬСТВА НЕШТА ЗАБАРАНІЦЬ. АБ ГЭТЫМ СВЕДЧЫЦЬ І ДОСВЕД ГАЗЕТЫ “СВАБОДА”, ЯКАЯ АДРАДЗІЛАСЯ Ў ВОЛЬНЫМ ДРУКУ.

ЦЯПЕР НАС МОЖНА ТАКСАМА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ НА АДРАСЕ

**WWW.VILNIA.COM**

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер”
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by)
**Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Тыраж** 299 экзэмпляраў